# ДЗЕ ЯБЛЫКУ ЎПАСЦІ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Інфармацыя пра гэта перадавалася ў выглядзе меркаванняў і чутак, а самай надзейнай крыніцай яе атрымання быў «ганец», адпраўлены ў суседнюю вёску даведацца, ці прыйшла доўгачаканая машына. Толькі гучны сігнал, які абвяшчаў аб тым, што яна на месцы, мог прымусіць усхваляваных людзей крыху супакоіцца.

Цяпер усё кардынальна змянілася: кожны дзень (без выхадных) завод накіроўвае 5 машын у аб'езд па навакольных вёсках. Можна загадзя патэлефанаваць і дамовіцца аб канкрэтным часе прыезду, а можна па звычцы проста чакаць. Але перажываць ужо дакладна не трэба: калі вы сабралі яблыкі, у вас іх абавязкова прымуць.

## Цана ім — тры капейкі

Яўген працуе вадзіцелем на заводзе ўжо шосты год, таму ў вёсках яго добра ведаюць і прымаюць за «свайго». «Максімальна за дзень можна зрабіць тры рэйсы па 5 тон. Гэта крыху больш, чым павінна лезці ў машыну, але вы самі разумееце... Наш заробак напрамую залежыць ад колькасці сабраных яблыкаў: 2 рублі за тону, тарыф не павышаўся ўжо гады чатыры, — з усмешкай распавядае мужчына. — А вось на яблыкі цана істотна змянілася і не на карысць тых, хто яшчэ хоча іх здаваць. Калі летась мы прымалі іх па 600—700 рублёў (6—7 капеек), то цяпер гэта — 3 капейкі за кілаграм».

Даведаўшыся 1 жніўня, калі пачаўся сезон нарыхтоўкі яблыкаў, пра тое, што іх будуць прымаць практычна за бясцэнак, уладальнікі садоў былі шакаваныя. Многія нават вырашылі адкласці здачу, у надзеі дачакацца павышэння цаны. Але, як толькі суседзі прыняліся за работу, усе жыхары вёскі пачалі паступова здавацца. Тут уступіў у сілу прынцып, пакладзены ў аснову філасофіі вясковага жыцця: не быць горшым за іншых. Ды і як можна ігнараваць адно з самых маштабных «мерапрыемстваў»? Гэта далёка не толькі спосаб заробку, а сапраўдная традыцыя, амаль рытуал, якую старажылы памятаюць яшчэ з часоў свайго юнацтва.

«Мы мяняем раёны збору праз год. Вось так тут гаспадарыць прырода: адзін год — галінкі ломяцца ад ураджаю, другі — на іх не знойдзеш ніводнага яблычка. Калі сёлета мы працуем у Дзятлаўскім раёне, то ў наступным годзе перамесцімся ў Шчучынскі і Гродзенскі. А яшчэ праз год — зноў вернемся сюды. Дзіўна, але гэта прыродная сістэма амаль ніколі не дае збою, — расказвае Яўген. — За сезон мы павінны нарыхтаваць 5—6 тысяч тон сыравіны, яна ўся ідзе на вытворчасць пладовага віна».

## «За якую мінімальную суму будзем здаваць? Ды за любую!»

Як успамінаюць жыхары вёскі, яшчэ не так даўно ў мясцовага завода быў сур'ёзны канкурэнт: аж з Брэсцкай вобласці да іх прыязджалі па яблыкі для дзіцячага харчавання. Паступова размова цалкам звяртаецца да тэмы мінулага: «У 71-м годзе за грошы, атрыманыя з ураджаю яблык, мы сыгралі невялікае вяселле... А я ў 96-м за такі заробак купіў наварочаны халадзільнік». Цяпер вынікі здачы ўраджаю зусім іншыя.

Напрыклад, вялікая сям'я з 7 чалавек, якая прыехала з Мінска на некалькі тыдняў, за два падыходы здала тону яблыкаў і атрымала 30 рублёў. «Пасля гэтага мы схадзілі ў краму і цалкам праелі наш заробак, — смеючыся расказвае Галіна. — На жаль, бацькоў мы ўжо страцілі, але сваім абавязкам лічым кожны год прыязджаць у родную хату. Яблыкі мы, вядома, здаём не дзеля грошай, проста не можам ужо інакш: усё свядомае жыццё, калі быў ураджай, гэтым займаліся. Як бы дзіўна гэта ні гучала, але так мы нібы вяртаемся ў гады дзяцінства, маладосці. Ды і зарадка гэтая нядрэнная», — жартуючы дадае жанчына.

А вось іншая Галіна прыехала з мужам і дзецьмі са Слоніма менавіта па заробак. Падняўшыся а пятай гадзіне раніцы, яны ўпотай пачалі абтрасаць некалі велізарны калгасны сад. Ад мінулага размаху засталося ўсяго некалькі дрэў, якія ў бліжэйшы час павінны выкарчаваць. «Усе грошы пойдуць на будаўніцтва дома, нам зараз важна ў прамым сэнсе кожная капейка, — стомлена адказвае на пытанні жанчына. — За якую мінімальную суму будзем здаваць? Ды за любую! Гэта ж грошы практычна з паветра».

Тэму пачынаюць абмяркоўваць у натоўпе: «І мы пакуль



Фота Дар'і КАСКО.

будзем здаваць, не так актыўна, як раней, але ж будзем. Проста шкада, што яблыкі валяюцца пад нагамі і псуюцца». На заўвагу аб тым, што яшчэ толькі пачатак жніўня, пладам трэба даць час падрасці, наліцца сокам, махаюць рукамі: «Пасля бульбу трэба капаць, там не да яблыкаў. А да кастрычніка яшчэ дажыць трэба».

«Хопіць балбатаць», — весела камандуе адна з пажылых жанчын, пасля чаго пад здзіўленымі поглядамі гараджан самастойна падымае поўны мех.

Пачынаецца рух: самыя дужыя залазяць на машыну — прымаць мяшкі, самыя ўважлівыя назіраюць за падлікамі. І кожны нібы незнарок спрабуе падгледзець, колькі ўдалося назбіраць суседу. На развітанне жыхары вёскі чарговы раз просяць вадзіцеля, каб ён абавязкова даведаўся, калі плануецца такое доўгачаканае павышэнне закупной цаны.

## Ці ёсць яшчэ варыянты?

Паназіраўшы за здачай яблыкаў напрамую небуйному прадпрыемству, звяртаемся па каментарый у найбольш уплывовую ў спажывецкай сферы арганізацыю — «Белкаапсаюз». Аказваецца, і ў іх работа ідзе поўным ходам. Па ўсёй краіне дзейнічае 700 прыёманарыхтоўчых пунктаў, опцыя здачы яблыкаў даступна ў 7 тысячах сельскіх магазінаў. Кожнае райпо арганізуе работу ў сярэднім ад 3 да 10 сезонных прыёманарыхтоўчых пунктаў як стацыянарных, так і па дамах. Спецыяльна да сезона масавых нарыхтовак наймаюць 1,5 тысячы пазаштатных работнікаў. Яблыкі на перапрацоўку прымаюць ад 3 капеек за кілаграм, максімальна за кілаграм можна атрымаць 5 капеек. А вось плады, якія ідуць на продаж, у 10 разоў даражэйшыя: 30-70 капеек за кілаграм.

Усю інфармацыю аб закупцы яблыкаў можна знайсці на інфармацыйных дошках сельскіх Саветаў, а таксама атрымаць у работнікаў аўталавак. Ніякіх абмежаванняў па аб'ёме пладоў, якія гатовы прыняць з аднаго двара, няма, зрэшты, не патрэбныя і даведкі. Галоўнае — якасць сыравіны.

## Догляд за яблынямі: інструкцыя ў 40 старонак

Даведаўшыся, куды здаваць ужо выгадаваныя яблыкі, спрабуем высветліць, як правільна іх вырошчваць, дзеля гэтага звяртаемся ў Інстытут пладаводства НАН Беларусі. Як адзначыў н**амеснік дырэктара па навуковай рабоце Анатоль КРЫВАРОТ**, на гэты момант ключавой тэндэнцыяй у галіне з'яўляецца памяншэнне тэрміну жыцця дрэў. Здавалася б, тут нейкая памылка друку, бо, наадварот, трэба рабіць усё магчымае, каб яго павялічыць. Аднак — не: значна больш эфектыўна за кароткі тэрмін максімальна выкарыстаць рэсурсы адной яблыні, замяніўшы яе пасля іншай. Таму цяпер яблыневыя дрэвы амаль ніколі не дасягаюць паўналецця: аптымальны перыяд іх жыцця (у залежнасці ад прышчэпкі) — 12-17 гадоў. Збіраць ураджай можна на 4-5-ты год пасля пасадкі, далей ідзе дзесяцігоддзе найбольшай аддачы, пасля чаго прадуктыўнасць паступова зніжаецца. Але так развіваюцца падзеі, калі пра свае гаспадарскія правы не заявіць прырода: нясвоечасовыя замаразкі і ўраганы, якія часта атакуюць тэрыторыю Беларусі, здольныя яшчэ паменшыць працягласць жыцця дрэў. Аднак не ўсё так дрэнна: гэта культура можа пладаносіць 100 і нават больш гадоў.

Па прызнанні Анатоля Крыварота, працэс догляду за яблыневымі дрэвамі даволі працаёмкі, інструкцыя да яго займае 40 старонак. «Усё залежыць ад мэтаў. Можна вырасціць высокае разгалістае дрэва і, седзячы ў яго цені, атрымліваць асалоду ад яго прыгожага выгляду. А можна правільным чынам падразаць галінкі, каб лёгка было здымаць плады. У Беларусі былі выведзеныя сарты, прызначаныя менавіта для нашых умоў надвор'я: Імант, Сябрына, Алеся, Весяліна, Дарунак, Поспех. Гэтыя яблыні, у адрозненне ад дрэў састарэлых сартоў, якія яшчэ часта сустракаюцца на прыватных падворках, багата пладаносяць кожны год. У сярэднім за сезон можна сабраць 20—30 тон з гектара, у спрыяльных абставінах гэтая лічба можа даходзіць і да 70 тон. У цэлым, тэрыторыя Беларусі выдатна падыходзіць для вырошчвання яблыкаў», — расказвае спецыяліст.

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ КАПИТАЛЬНЫХ СТРОЕНИЙ**

**РУП «Брестское отделение Белорусской железной дороги»**

| № лота | 1 |
|---|---|
| Наименование, местонахождение и характеристика объекта | Право заключения договора аренды капитального строения с инвентарным № 100/С-46612 (**пакгауз**) площадью 267,2 кв.м, с объектом принадлежности (**рампа** 386 кв.м), по адресу: *г. Брест, ст. Брест–Полесский, для хранения, погрузки и выгрузки грузов* |
| Балансодержатель | «Брестская дистанция гражданских сооружений» |
| Начальная цена продажи (BYN) | **3 рубля 40 копеек** |
| Сумма задатка (руб.) | 34 копейки |
| Срок аренды | **5 лет** |
| Сумма арендной платы в месяц | **200,4** б.а.в. (здание склада); **19,3** б.а.в. (рампа) |
| Условия оплаты | Разовый платеж |
| Размер штрафа, руб. | 2100 |
| Условия продажи | **Без условий** |
| Организатор аукционных торгов | **КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» г. Брест, ул. Ленина, 50. Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65. www.bgcn.by** |

**ПРИМЕЧАНИЕ:**
Для участия в аукционе юридических или физических лиц, в том числе индивидуальных предпринимателей, прилагаются к заявлению, подаваемому:
1. юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь: копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;
2. юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; копия платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;
3. индивидуальным предпринимателем: копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя; копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;
4. физическим лицом – копия платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона.
При заключении соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона организатору аукциона предъявляются: представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность.
*Сумма задатка перечисляется в КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на счет № 3012780360011 в ф-ле № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Брест, ул. Московская, 202, код банка 246, УНП 290433924.*
Порядок оформления участия в аукционе и проведения торгов определяется Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. №1049.
Право заключения договора аренды возникает у победителя аукциона с момента внесения им определенной в ходе аукционных торгов цены за право аренды нежилого помещения. Данная сумма должна быть внесена победителем в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. Договор аренды должен быть подписан в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
**Победитель аукциона обязан оплатить организатору аукциона в течение 3 рабочих дней с даты проведения торгов** сумму в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.

**Аукцион состоится 15 сентября 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.**
**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 16.08.2016 г. до 17.30 09.09.2016 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; выходной день: сб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50. Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65.**
**www.bgcn.by; www.brest-region.gov.by; www.gki.gov.by**

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»**

**22 сентября 2016 года проводит 9-й от 21.07.2016 года повторный открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности**

| Номера лотов | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 140 | Автоцистерна для ракетного горючего АЦГ-5-4320 с/о 516 на УрАЛ-4320 ш. 033780 дв. 711743 1985 г. 4 кат. 39 м/ч 1132 км | н.п. Калинковичи, в/ч 55461/2 | 17 600,00 | 1 760,00 |
| 141 | Автоцистерна для агрессивных жидкостей АКЦ-4-255Б1 с/о 3001 на КрАЗ-255Б1 ш. 561849 дв. 000928 1986 г. 4 кат. 60 м/ч 432 км | н.п. Калинковичи, в/ч 55461/2 | 8 100,00 | 810,00 |
| 142 | Автоцистерна для агрессивных жидкостей АКЦ-4-255Б1 с/о 2997 на КрАЗ-255Б1 ш. 573203 дв. 020517 1986 г. 4 кат. 53 м/ч 409 км | н.п. Калинковичи, в/ч 55461/2 | 8 100,00 | 810,00 |
| 149 | Седельный тягач КамАЗ-54112 ш. 024031 дв. 539860 1989 г. 4 кат. 101 070 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 4 500,00 | 450,00 |
| 150 | Автошасси МАЗ-5335 ш. 27734 дв.8828580 1988 г. 4 кат. 88 112 км Кузов-фургон КМ-500 № б/н 1988 г. 4 кат. | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 4 500,00 | 450,00 |

**Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж 22 сентября 2016 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 19 сентября 2016 года**.

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3-х банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5**-ти банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10**-ти банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300 белорусских рублей и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – р/с 3012244970018 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29, код 153001739, российские рубли – р/с 3012107883087 в Центре банковских услуг №701, ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 369, УНН 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент – Сбербанк России г. Москва № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225 ИНН 7707083893 к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России №30101810400000000225, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС**.

**Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81. Наш адрес в интернете: www.bsk.by, auk@bsk.by.**